ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры
Гродзенскага аблвыканкама
А.В. Клімовіч
2021 г.

**ІНСТРУКЦЫЯ аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю “Артыстычныя сустрэчы “Гродна-Беласток”**

1. Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення фестывалю “Артыстычныя сустрэчы “Гродна-Беласток” (далей – Фестываль).
2. Мэтамі і задачамі Фестывалю з’яўляюцца: яднанне польскага і беларускага насельніцтва Гродзенскай вобласці і Падляшскага ваяводства і адраджэнне культурных традыцый нацыянальных супольнасцей; развіццё міжнацыянальнага сяброўства; папулярызацыя работы ўстаноў культуры па адраджэнні і захаванні беларуска-польскай спадчыны Гродзеншчыны; удасканаленне выканальніцкага майстэрства і сцэнічнай культуры аматарскіх калектываў; прыцягненне моладзі для ўдзелу ў калектывах.
3. Арганізатарамі Фестывалю з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”), Галоўнае праўленне Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку.
4. Для кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю ствараецца арганізацыйны камітэт (далей - аргкамітэт), які фарміруецца з прадстаўнікоў дзяржаўных органаў і зацікаўленых арганізацый (дадатак 1).
5. Аргкамітэт:
5.1. уносіць на разгляд упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама прапановы па каштарысе выдаткаў на арганізацыю і правядзенне Фестывалю, умовах правядзення Фестывалю і відах заахвочвання ўдзельнікаў;
5.2. узгадняе склад рэжысёрска-пастановачнай групы, спіс удзельнікаў і праграму правядзення Фестывалю, узоры ўзнагарод, іншую атрыбутыку, план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні Фестывалю;
5.3. вызначае віды і формы інфармацыйна-рэкламнай падтрымкі Фестывалю;
5.4. вырашае іншыя пытанні, звязаныя з падрыхтоўкай і правядзеннем Фестывалю.

6. Фестываль праводзіцца ў два туры: 1 тур (адборачны) – праводзіцца ў Гродзенскай вобласці Рэспублікі Беларусь і Падляшскім ваяводстве Рэспублікі Польшча асобна з сакавіка па ліпень. 2 тур (заключны) – праводзіцца ў г. Гродна ў жніўні 2021 г. і прысвячаецца Году народнага адзінства.

6.1. У выпадку пераносу тэрмінаў правядзення Фестывалю ці яго адмены па аб'ектыўных прычынах калектывы і выканаўцы, якія даслалі заяўкі, будуць паведамлены індывідуальна.

7. Для ўдзелу ў 1 туры Фестывалю калектывам і індывідуальным ваканаўцам (дуэтам) неабходна даслаць у аргкамітэт відэазаяўку (відэапрэзентацыю) выступлення да 1 ліпеня 2021 года (для беларускіх калектываў – на адрас: г. Гродна, вул. Савецкая, 8, ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", omcnt@mail.grodno.by; для польскіх калектываў – на адрас: г. Беласток, вул. Варшаўская, 11).

8. Да ўдзелу ў 2 туры Фестывалю аргкамітэтам запрашаюцца лепшыя (па выніках 1 тура) калектывы і выканаўцы ўстаноў культуры, адукацыі, іншых арганізацый, супольнасцей і грамадскіх аб'яднанняў Рэспублікі Беларусь (16 калектываў і выканаўцаў) і Рэспублікі Польшча (16 калектываў і выканаўцаў): вакальна-харавыя, інструментальныя, харэаграфічныя калектывы і індывідуальныя выканаўцы, дуэты.

9. З мэтай папулярызацыі беларуска-польскага харавога, інструментальнага і харэаграфічнага мастацтва аргкамітэт запрашае да ўдзелу ў Фестывалі прафесійныя калектывы мастацкай творчасці.

10. Асноўныя крытэрыі для адбору ўдзельнікаў Фестывалю: выканальніцкае майстэрства; сцэнічная культура; адметнае ўвасабленне нацыянальнага каларыту.

11. Удзельнікі Фестывалю прадстаўляюць:

калектывы Рэспублікі Беларусь – два рознахарактарныя нумары (польская песня, інструментальны твор ці польскі танец) працягласцю не болей 3,5 хвілін кожны; індывідуальныя выканаўцы (дуэты) – 1 нумар (польская песня ці інструментальны твор);

калектывы Рэспублікі Польшча – два рознахарактарныя нумары (беларуская песня, інструментальны твор ці беларускі танец) працягласцю не болей 3,5 хвілін кожны; індывідуальныя выканаўцы (дуэты) – 1 нумар (беларуская песня ці інструментальны твор).

12. Усім калектывам-удзельнікам і індывідуальным выканаўцам 2 (заключнага) тура прысвойваюцца званні "дыпламант фестывалю "Артыстычныя сустрэчы "Гродна-Беласток" і ўручаюцца прызы і дыпломы ў рамках.

13. Фінансаванне Фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя

мерапрыемствы (харчаванне іншагародніх удзельнікаў Фестывалю, прызы, дыпломы, рамкі для дыпломаў, арэнда мабільнага сцэнічнага комплексу, паслугі па прадастаўленні гукавога абсталявання, партэра (крэслаў), транспартныя паслугі і арэнда спецыяльнай тэхнікі (пагрузчык), аплата выступленняў прафесійных калектываў).

14. Для фінансавання Фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

15. Арганізатары Фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення фестывалю "Артыстычныя сустрэчы "Гродна-Беласток"

## СКЛАД АРГКАМІТЭТА

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, старшыня аргкамітэта; |
| Сычэўскі Я.Я. | старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку, сустаршыня аргкамітэта; |
| Куратчык С.В. | намеснік начальніка ўпраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, намеснік старшыні аргкамітэта; |
| Чарняк Д.Р. | начальнік аддзела культуры Гродзенскага гарвыканкама; |
| Жук-Куніцкая І.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама; |
| Мурэня А.У. | дырэктар ДУК "Гродзенскі АМЦНТ". |